# ТВОРЧАСЦЬ У. ЛІПСКАГА Ў ШКОЛЕ: СПРОБА ПАПУЛЯРЫЗАЦЫІ

***Г. А. Лукашэвіч***
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск)*
*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле прыводзяцца вынікі анкетавання вучняў 5 “В” і 5 “Ж” класаў ДУА “Гімназія № 43 г. Мінска”. Прапануецца аналіз урока па тэме “У. Ліпскі. «Рыгоркавы прыгоды»”, праведзенага з мэтай папулярызацыі творчасці гэтага аўтара.

**Ключавыя словы:** У. Ліпскі; раман; анкетаванне; школьнікі; папулярызацыя.

У. Ліпскі мае багаты ў жанравых і тэматычных адносінах набытак з твораў дзіцячай літаратуры. Жанравы арсенал яго мастацкіх тэкстаў для дзяцей надзвычай прадстаўнічы: апавяданні, казкі забаўлянкі, небыліцы і загадкі; фантастычна-прыгодніцкая аповесць “Пра Андрэйку Добрыка і Чорціка Дуроніка”, аповесці-казкі “Прыгоды Нуліка”, “Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска”, казка-забаўлянка “Вясёлая азбука”, зборнікі нарысаў “Сцвіцязанская русалка”, “Вясёлка над Нёманам”, “Гомельская зямля – радзіма твая і мая” і інш. Кнігі сведчаць пра ўменне пісьменніка кантактаваць з маленькім чытачом, закранаючы розныя тэмы: сур’ёзныя і жартаўлівыя, пра ўзаемаадносіны паміж людзьмі, пра важнасць добрых учынкаў і пазбяганне злосці і крыўды. Аўтар спрабуе пазнаёміць дзяцей з “дарослымі” праблемамі, разумець якія дзеці павінны вучыцца з маленства.

Але ці вядома яго творчасць тым, каму яна адрасавана? З мэтай выявіць, ці ведаюць вучні пятых класаў творы пісьменніка, намі было праведзена анкетаванне “Уладзімір Ліпскі – дзецям”. У дадзеным анкетаванні прымалі ўдзел вучні 5 “В” і 5 “Ж” класаў ДУА “Гімназія № 43 г. Мінска”. Агульная колькасць вучняў у гэтых класах – 55 чалавек, якія актыўна адказвалі на пытанні. Важна заўважыць, што дадзены кантроль быў праведзены напярэданні ўрока дадатковага чытання, г. зн., што вучні не праслухалі матэрыял і не чыталі творы пісьменніка загадзя. Усе вынікі – уласныя веды школьнікаў, узровень іх дасведчанасці і кругагляду.

Так, на пытанне № 1 “Ці вядома вам прозвішча У. Ліпскі?” станоўча адказалі 52 вучні, што складае вялікую частку правільных адказаў сярод усіх вучняў. На пытанне № 2 “Галоўным рэдактарам якога часопіса з’яўляецца У. Ліпскі?” правільным вызначылі адказ “Вясёлка” 37 вучняў. Пытанне № 3 “Знайдзіце сярод прапанаваных варыянтаў творы, аўтарам якіх з’яўляецца У. Ліпскі” вучням падалося адным з самых цяжкіх, бо правільны адказ – “Рыгоркавы прыгоды”, “Мілаградскі конік”, “Вясёлая азбука” – далі толькі 23

вучні. На пытанне № 4 “Якая ідэя аб’ядноўвае многія творы У. Ліпскага?” правільна адказалі 48 вучняў сярод 55 апытаных. На пытанне № 5 “У якіх жанрах працуе У. Ліпскі?” толькі 16 чалавек адказалі правільна.

Такім чынам, прааналізаваўшы адказы вучняў 5 “В” і 5 “Ж” класаў, мы прыйшлі да наступных высноў:

1) дзецям вядома прозвішча пісьменніка У. Ліпскага (большасці вучняў знаёма гэта прозвішча яшчэ з пачатковай школы, таму што некаторыя ўрыўкі з твораў У. Ліпскага ўключаны ў школьную праграму пачатковай школы);

2) большая колькасць вучняў адказала правільна на пытанне “Галоўным рэдактарам якога часопіса з’яўляецца У. Ліпскі?”. Аднак не ўсе дакладна выбіралі адказы, шмат вучняў сумнявалася. Верагодна, гэта таму, што часопісы страчваюць сваю актуальнасць, ім на змену прыходзяць інфармацыйныя тэхналогіі;

3) пры аналізе вучнёўскіх адказаў на пытанне “Знайдзіце сярод прапанаваных варыянтаў творы, аўтарам якіх з’яўляецца У. Ліпскі” мы зрабілі вывад, што дзеці губляюцца ў пералічаных творах. Першы адказ – “Дарэктар”, “У старых дубах”, “Пан і рэчка” – выбралі 4 вучні, таму што ў праграме за 5 клас на III чвэрць прадугледжана вывучэнне двух з гэтых твораў Я. Коласа (“Дарэктар” і “У старых дубах”). Гэта сведчыць пра тое, што ступень засвоенасці твораў беларускай літаратуры не цалкам супадае з мэтамі навучання. Дзецям цяжка даецца разуменне мастацкіх тэкстаў, яны не арыентуюцца ў жанрах і манеры пісьма таго ці іншага аўтара.

Прааналізаваўшы адказы вучняў, выявіўшы іх зацікаўленасць асобай У. Ліпскага, мы прынялі рашэнне правесці ўрок дадатковага чытання, прысвечаны творчасці дадзеннага пісьменніка для дзяцей (“У. Ліпскі. «Рыгоркавы прыгоды»”). Перад тым, як правесці ўрок, мы паставілі перад сабой наступныя задачы:

1) пазнаёміць з біяграфічнымі звесткамі пра У. Ліпскага;

2) расказаць пра светапогляд пісьменніка, яго жыццёвае крэда;

3) метадам пераліку і сціслай характарыстыкі пазнаёміць з шэрагам кніг, прысвечаных тэме дзяцінства;

4) разгледзець першую друкаваную кнігу для дзяцей У. Ліпскага – аповесць-казку “Рыгоркавы прыгоды”;

5) прааналізаваць учынкі галоўнага героя і абмеркаваць іх з вучнямі, вызначыць матывы паводзін Рыгоркі.

Пры выкананні ўсіх заданнях на кожным этапе ўрока дзеці прымалі актыўны ўдзел. Выкарыстанне разнастайных заданняў садзейнічала развіццю разумовай дзейнасці, якая неабходна для далейшага навучання і павышэння эфектыўнасці адукацыйнага працэсу.

Добрая псіхалагічная атмасфера, зацікаўленасць навучэнцаў ходам урока падтрымлівалася дзякуючы стварэнню праблемных сітуацый, супрацоўніцтву з вучнямі.

Па выніках урока можна канстатаваць, што пастаўленыя мэта і задачы былі выкананы наступным чынам:

– *адукацыйная:* пазнаёміўшыся з біяграфчнай даведкай, вучні атрымалі заданне – прачытаць урыўкі з аповесці-казкі, даць ацэнку паводзін героя; падчас прагляду відэафільма пра У. Ліпскага дзеці занатоўвалі самыя цікавыя, на іх погляд, факты, а потым агучвалі іх для ўсяго класа;

– *развіццёвая:* падчас урока вучні па прапанаваных заданнях размаўлялі паміж сабой, ствараючы атмасферу дыялогу, адстойвалі свой пункт гледжання, слухалі меркаванні іншых, задавалі пытанні, развіваючы дыялагічнае маўленне, дасягаючы ўмення ініцыяваць узаемадзеянне з настаўнікам і аднакласнікамі. Выступаючы з адказамі, вучні развівалі маналагічнае маўленне. Кожны вучань альбо выступаў з вусным адказам, альбо рыхтаваў індывідуальнае заданне.

– *выхаваўчая:* талерантнасць складаецца з добразычлівага стаўлення да іншых людзей і іх працы, умення прыслухоўвацца і паважаць меркаванне іншых, нават калі яно супрацьлеглае. Гэтаму пяцікласнікі вучыліся, ажыццяўляючы міжгрупавую працу, выконваючы творчыя заданні. Перад вучнямі ставілася мэта размаўляць культурна, слухаць адзін аднаго.

Працаздольнасць навучэнцаў на ўроку забяспечвала за кошт выкарыстання інавацыйна-камукатыўных тэхналогій, стварэння станоўчага эмацыйнага настрою і спрыяльнай псіхалагічнай атмасферы, падбору цікавага, насычанага матэрыялу, які мае тэарэтычную, практычную і пазнавальную значнасць.

Як уяўляецца, праведзеная праца паспрыяе папулярызацыі мастацкага набытку У. Ліпскага, актывізуе ўвагу пяцікласнікаў да творчасці гэтага аўтара.

## АПАВЯДАННЕ “КВЕТКА ПАЖОЎКЛАЯ” М. ЗАРЭЦКАГА: СКЛАДАНАСЦІ КАХАННЯ “НОВАЙ” ЖАНЧЫНЫ

***А. С. Сівіцкая***
*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка (Мінск)*
*Навук. кір. – Н. В. Заяц, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** Даследуецца спецыфіка раскрыцця тэмы кахання ў апавяданні “Кветка пажоўклая” М. Зарэцкага. Разглядаюцца складаныя адносіны паміж галоўнай гераіняй Марынай Гарновай і яе прыхільнікамі.

**Ключавыя словы:** М. Зарэцкі; “Кветка пажоўклая”; тэма кахання; “новая” жанчына; Марына Гарнова.